# Альтэрнатыўная адукацыя

Парадак, што склаўся ў нашай адукацыі, успрымаецца сёння калі не ўсімі, то многімі як спрадвечна ўласцівы свету, як натуральны. Сумняваацца ў ім нам, людзям, сфарміраваным гэтым парадкам, часта азначае наставіць пад сумненне саміх сябе, увесь свой мінулы і цяперашні вопыт, сваё месца ў культурнай іерархіі. Не так ужо многа засталося ў нашым свеце ўстойлівых рэалій, каб бясклапотна ставіцца да наяўных. Гэтым часткова можна растлумачыць тую акалічнасць, што ў сучаснай школы так многа прыхільнікаў. У псіхалагічным плане, захоўваючы і ахоўваючы адукацыю, мы ахоўваем і сябе ад абяссэншвання. Па крайняй меры, нам так здаецца. І сапраўды, калі мы раптам заўтра зразумеем, што школа, у якую павінна ісці наша дзіця (або мы самі), праблематычная ў сваім сённяшнім выглядзе, то што нам у гэтым выпадку рабіць?

Між тым пытанне аб разумнасці парадку рэчаў, што склаўся ў адукацыі, перыядычна ўсплывае з нейкіх глыбінь грамадскай неўсвядомленасці ў якасці надзённай праблемы свайго часу. Часта гэта адбываецца на парозе перамен, што асаблівым чынам характарызуе адукацыю як індыкатар сацыяльных настрояў.

Крытыка адукацыі, з якіх бы пазіцый яна ні вялася, сутыкаецца з цэлым шэрагам абаронных аргументаў, адвесці якія аказваецца не заўсёды проста. Прывядзём толькі некаторыя з іх:

*"Мы ўсе вучыліся ў гэтай школе і дзякуючы ёй сталі нядрэннымі людзьмі".*

Гэты тэзіс абяззбройвае. Яго праблематызацыя міжвольна сутыкаецца з годнасцю апанента, а саманавагу, як вядома, лепш не закранаць. Бо не скажаш жа яму нешта накшталт "знайшоў чым ганарыцца". У той жа час вельмі можа быць, што рэальная дасканаласць (калі яна і мае месца) дасягнута нашым апанентам не дзякуючы, а насуперак школе. "*Пасля таго* не азначае *ў выніку таго*", — любілі казаць старажытныя мудрацы.

*"Школа была такой заўсёды, і яе разумнасць праверана часам. Крытыкуе ж яе, як правіла, той, хто ў мінулым быў нядбайным вучнем".*

Апошняе бывае правільным, хаця і не заўсёды. Я ўспамінаю часам, як у сярэдзіне 80-х вядомы расійскі педагог-наватар М. П. Шчацінін на пытанне настаўніцкай аўдыторыі, зададзенае з разлікам на традыцыйную сентыментальнасць, аб тым, як ён ставіцца да школы, дзе вучыўся ў дзяцінстве, адказаў рэзка і коратка: "Я яе ненавіджу!". Не выключана, што сама нядбайнасць закладзена ў школьных умовах, і тады крытыка мае асабістыя прычыны. Што ж датычыцца першага — спрадвечнасці і разумнасці, то тут ёсць мноства падстаў для сумнення. Вельмі ўжо значная варыятыўнасць гэтай разумнасці паўстае сёння перад дапытлівым розумам.

Перш чым прадаставіць слова госцю нашай рубрыкі, раскажу невялікую перадгісторыю. Вось ужо шмат гадоў на занятках па педагагічнай псіхалогіі я абмяркоўваю са студэнтамі праблему альтэрнатыўнай адукацыі, менавіта той, што непадобна на звыклае "разумнае, добрае, вечнае". Аднак, як і многім маім калегам, у сваіх разважаннях мне даводзіцца апеляваць да таго, аб чым чытаў у кнігах або чуў ад відавочцаў. У асноўным гэта плён маіх рэканструкцый, домыслаў, а часам, чаго грахі ўтойваць, і вымыслаў. Усё, да чаго я імкнуся ў рабоце з гэтымі зместамі, зводзіцца да даволі простай мэты: сфарміраваць у студэнтаў канструктыўныя адносіны да адукацыі як гістарычна абумоўленай практыкі чалавечага мыслення і дзейнасці. Альтэрнатыўная адукацыя (як і іншая, якая супрацьстаіць традыцыі) выступае месцам актыўнага грамадскага эксперыментавання, той пляцоўкай, дзе адпрацоўваюцца новыя педагагічныя ідэі і формы. Невыпадкова альтэрнатыўная адукацыя заўсёды была і застаецца прадметам найвастрэйшай крытыкі традыцыяналістаў. На жаль, у Беларусі няма альтэрнатыўных адукацыйных школ, і нават, няхай даруюць мне калегі з педагагічных універсітэтаў, ні ў адным з іх і намёку няма на колькі-небудзь сур'ёзны аналіз гэтай унікальнай культурнай з'явы. Я кажу не пра выпадковы пералік у аглядной лекцыі, а пра сур'ёзныя і працяглыя тэарэтычныя і практычныя штудыі студэнтаў у гэтым напрамку.

Дык вось аднойчы, у час чарговай гарачай дыскусіі на семінары па педагагічнай псіхалогіі ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, з апошняй парты пацягнулася чыясьці рука. Следам за рукой з'явілася і яе гаспадыня, якая ўзялася выступіць экспертам ва ўзнікшай спрэчцы. Калі ж я спытаў яе аб тым, на якой падставе яна прыпісвае сабе экспертную функцыю, дзяўчына адказала: "Я вучылася ў альтэрнатыўнай школе".

Так адбылося наша змястоўнае знаёмства, якое перарасло ў яе даклад на семінары і нарэшце ў прапануемы сёння чытачу тэкст. Спадзяёмся, што ён добразычліва будзе сустрэты педагагічнай публікай.

Такім чынам, на подыуме нашага вернісажа выпускніца тэалагічнага факультэта Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта Аляксандра Анісімава.

Сустракайце!

**А. ПАЛОННІКАЎ,**
**кандыдат псіхалагічных навук, вядучы рубрыкі.**

# УРОКІ АДЭЛАІДЫ

Школа, у якой я вучылася, знаходзілася ў Паўднёвай Аўстраліі ў раёне Адэлаідскіх узгоркаў. Гэта ўзвышанае месца з'яўляецца маленькім еўрапейскім аазісам за 40 км ад сухой і гарачай Адэлаіды. Многія багатыя англійскія эмігранты пачатку XIX стагоддзя тут знаходзілі прытулак, і ў выніку, нягледзячы на частыя пажары, там і сёння захавалася шмат велічных віктарыянскіх сядзіб. У адной з іх і размясцілася мая школа.

Яна займала тры карпусы. Вакол гэтых дамоў раскінуліся велізарныя англійскія сады, поўныя кветак, еўрапейскіх дрэў і гротаў. Школа называлася "Marbury", што ўяўляе абрэвіятуру з імёнаў кожнага, хто садзейнічаў яе заснаванню. Гэта былі Маргарэт Лэнглі ("Ма-"), псіхолаг і жонка галоўнага заснавальніка, Бур Дол ("-bu-"), які ўдастоіўся месца ў назве школы, ахвяраваўшы для яе дзве свае сядзібы, і, вядома ж, Хары Лэнглі ("-ry"), фрэйдысцкі дзіцячы псіхіятр. (Апошні з трох будынкаў школы быў пакінуты яму ў спадчыну адным старым суседам.)

На гербе школы былі выява вялікага белага дуба на сінім фоне і лозунг: "Дзіця — бацька чалавецтва". Гэтыя словы сапраўды выражалі задуму і задачу школы — самазнаходжанне, пазнанне і, нарэшце, самавыражэнне ў дзяцінстве і праз дзяцінства. Гэта, вядома ж, рэзка кантраставала са звычайнымі нашымі аўстралійскімі школамі, у якіх навучанне было больш падобным на дрэсуру. (У Аўстраліі да гэтага часу лічыцца законным "лёгкае" цялеснае пакаранне.) Школа Лэнглі была своеасаблівым пратэстам супраць прымусовай формы адукацыі ў нашай краіне. У 70-я гады, калі яна была заснавана, школа насцярожана ўспрымалася дзяржавай. Яе прынцыпы, зразумела, стваралі неадназначнае ўражанне на фоне перажыткаў віктарыянскага кансерватызму. Аднак гучнае імя "артадаксальнага", фрэй-